# УСПАМІН АБ БУДУЧЫМ



Існуе думка, што новае — гэта добра забытае старое. Адносна педагогікі такое сцвярджэнне мне ўяўляецца цалкам слушным. Хутчэй за ўсё найбольш каштоўныя ідэі ў галіне навучання і выхавання чалавецтва даўно выказала. На нашу долю застаецца ў асноўным прыпамінанне... Але што, калі і чаму прыпамінаецца?

Рызыкну выказаць адно меркаванне. Калі ўсё ідзе нармальна, прыпамінанне выпадковае і сам працэс прыпамінання рэдка фіксуецца ў свядомасці. Але вось нешта ламаецца ў нашым жыцці, яго ход перастае нас задавальняць. Пачынаецца час перамен. Мы сканцэнтроўваемся і з вялікім намаганнем прыпамінаем...

Беларуская адукацыя, асабліва пачатковая школа, з кожным днём усё больш востра адчувае неабходнасць змен. Ранейшыя каштоўнасці і мэты, вынікі пачатковай адукацыі перастаюць задавальняць настаўнікаў, бацькоў, саміх школьнікаў. Усё больш відавочнай для многіх становіцца вычарпанасць устаноўкі пачатковай школы на падрыхтоўку дзіцяці да атрымання адукацыі ў яе сярэднім звяне. Бясспрэчна, пераемнасць неабходна, але гэтая акалічнасць не павінна перакрэсліваць спецыфіку ўласных мэт і задач пачатковай адукацыі, асаблівую каштоўнасць гэтага перыяду жыцця маленькага чалавека.

Дык навошта ж патрэбна сёння пачатковая школа? На якія жыццёвыя пытанні чалавека яна павінна даваць адказы? І нарэшце, якія з напрацаваных папярэднімі пакаленнямі ідэй варта акцэнтаваць і падпарадкаваць ім усе астатнія? Як зрабіць, каб падмурак нацыянальнай адукацыі, што зараз у нас будуецца, не атрымаўся рыхлым?

Асаблівую праблему ў гэтай сувязі ўяўляе якраз выбар ідэі або сістэмы ідэй, закліканых арганізаваць нашу адукацыйную, гістарычную і культурную сітуацыю. Некаторыя школьныя работнікі схільныя ў дадзеным выпадку кіравацца наступным шаблонам: "Практыка — крытэрый ісціны". Маўляў, зробім, а потым паглядзім. На жаль, у адукацыі часта так бывае, што за эксперыменты ў галіне педагогікі адказваць даводзіцца каму хочаце, толькі не іх ініцыятару. Вельмі ўжо аддаленымі бываюць вынікі. Назіраючы за ахопленымі рэфарматарскім запалам дзеячамі адукацыі, я часта думаю: "Няўжо, для таго каб пераканацца ў недарэчнасці той ці іншай педагагічнай ідэі, трэба абавязкова яе практыкаваць?"

Менавіта таму мы і вырашылі адкрыць у нашым часопісе рубрыку "Педагагічны вернісаж", дзе хацелі б арганізаваць дэманстрацыю самых разнастайных ідэй з галіны пачатковага навучання і выхавання. Варыятыўнасць, практычная накіраванасць, сціслаcць выкладання — вось тыя крытэрыі, на якія мы мяркуем арыентавацца пры адборы матэрыялаў для публікацыі.

Мэта, якую ставіць рэдакцыя часопіса, — гэта публічная экспертыза філасофскіх, метадычных, псіхолага-педагагічных ідэй, прапануемых для ўдасканалення нашай агульнай справы — пачатковай школы Беларусі.

Менавіта публічная, шматбаковая экспертыза, а значыць, і аб'ектыўная крытыка, удакладненне, праігрыванне варыянтаў і сцэнарыяў рэалізацыі ў ідэальным плане — залог праверкі педагагічных ідэй на жыццёвасць. Вось чаму ў рубрыцы плануецца публікацыя экспертных заключэнняў спецыялістаў, альтэрнатыўных меркаванняў апанентаў.

Вернісаж педагагічных ідэй мы адкрываем публікацыяй маладога псіхолага Вольгі Парахневіч. На яе "стэндзе" ў вернісажы вопыт вядомага ў нашай айчыне педагога і псіхолага, настаўніка пачатковых класаў Шалвы Аляксандравіча Аманашвілі. Але гэты вопыт прадстаўлены не як сістэматычнае апісанне, а наўмысна фрагментарна, у тым аспекце, у якім аўтару (В. Парахневіч) ён уяўляецца асабліва каштоўным для перавызначэння задач пачатковай адукацыі.

Задумаемся, паважаныя чытачы, разам з ёй. Можа, ісціна недзе побач, а мы яе ў мітусні і клопатах проста не заўважаем?

**А. ПАЛОННІКАЎ,**
**вядучы рубрыкі, член рэдакцыйнай калегіі часопіса "Пачатковая школа".**